Падтрымай "Вясну" на PATREON

Мазырскаму актывісту паўторна прысудзілі штраф за акцыю ў падтрымку незалежнасці

23.04.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Уладзімір Неўмяржыцкі ў судзе. Фота з сайта palesse.press

Мазырскаму актывісту Уладзіміру Неўмяржыцкаму паўторна прысудзілі штраф за акцыю ў падтрымку незалежнасці. Праваабаронцы перакананыя, што суддзі проста выпраўляюць уласную блытаніну, паведамляе palesse.press.

30 студзеня актывісту Беларускага нацыянальнага кангрэсу Уладзіміру Неўмяржыцкаму суддзя суда Мазырскага раёна Дзмітрый Мазай, паводле артыкула 23.34 КаАП прысудзіў штраф за ўдзел у акцыях пратэсту супраць «паглыбленай інтэграцыі» Беларусі і Расіі 20 і 21 снежня 2019 года ў Мінску.

Гэтае рашэнне актывіст абскардзіў у Гомельскім абласным судзе. Суддзя **Васіль Бягун** пакінуў рашэнне раённага суда без зменаў. Пры гэтым у сваім рашэнні Васіль Бягун доўга апісваў дзеянні Неўмяржыцкага, але потым зрабіў выснову, што сукупнасць доказаў дала падставы прызнаць вінаватым у здзяйсненні правапарушэння чамусьці **Уладзіміра Няпомняшчых** з Гомеля.

21 красавіка справу нечакана адправілі на новы разгляд у суд Мазырскага раёна. Уладзімір Неўмыржыцкі сам не мог зразумець, чым выкліканы новы перагляд у судзе першай інстанцыі. Але падчас пасяджэння высветлілася, што старшыня Гомельскага суда адмяніў рашэнне свайго падначаленага Васіля Бегуна і пастанавіў накіраваць справу зноў у суд Мазырскага раёна для разгляду іншым суддзёй.

Як прайшоў новы суд?

Гэтым разам справу пераглядала суддзя **Элеанора Ярмоленка**. Яна адразу адхіліла хадайніцтва Неўмяржыцкага пра тое, каб вяліся выдэаздымкі пасяджэння, а потым і выдаліла з залы мясцовага відэаблогера Youtube-канала «Мозырь для жизни», які працягваў здымаць на тэлефон.

Неўмяржыцкі настойваў на тым, што права выказваць сваё меркаванне мірным шляхам яму дае Канстытуцыя Беларусі і Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, а абмежаванні, якія накладзеныя мясцовым законам «Аб масавых мерапрыемствах», не падмацаваныя неабходнасцю абароны дзяржаўных, грамадскіх інтарэсаў, абароны здароўя, маральнасці грамадства і правоў іншых асобаў. Ён прасіў спыніць справу ў сувязі з сыходам тэрміну прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці.

Тым не менш, **Элеанора Ярмоленка** прыняла рашэнне прызнаць актывіста вінаватым і зноў прысудзіць Уладзіміру Неўмяржыцкаму штраф у тыя ж самыя **30 базавых вялічынь**, які раней прызначыў суддзя **Дзмітрый Мазай**.

> *«Я – свабодны чалавек, і маю права выказваць свае меркаванні свабодна, не пытаючы ні ў каго на гэта дазволу. І я буду гэта рабіць, нягледзячы на карныя захады з боку дзяржавы»*, – пракаментаваў новы суд **Уладзімір Неўмяржыцкі**.



Праваабаронца "Вясны" Уладзімір Целяпун. Фота з сайта palesse.press

На судовым пасяджэнні прысутнічаў праваабаронца «Вясны» **Уладзімір Целяпун,** які дапамагаў Неўмяржыцкаму складаць скаргі па ранейшых прысудах і абараняцца ў судзе.

> *«Суддзі з абласнога суда, якія ў выніку судовых канвееraў над удзельнікамі мірных сходаў без нармальнага разбіральніцтва панапісвалі бязглуздзіцы ў сваіх рашэннях, вырашылі выправіць уласныя памылкі і правесці новую серыю судоў па той самай справе. Пакуль не ведаю, ці будзе Уладзімір Неўмяржыцкі абскарджваць гэтае рашэнне, але тое, што яно незаконнае і антыдэмакратычнае – відавочна!»*

Навіны ад Spring96.org у Telegram. Падпішыся на наш канал *https://t.me/viasna96*

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre
memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

